Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Мінску - масавае судзілішча над незалежнымі журналістамі дапоўнена

14.12.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Вольга Чайчыц у судзе 14 снежня. Фота з Facebook

У судзе Першамайскага раёна Мінска сёння, 14 снежня, разглядаюцца ажно пяць адміністрацыйных спраў супраць беларускіх незалежных журналістаў. Усіх судзяць па сумна вядомым артыкуле 22.9 (ч.2) КаАП, то бок за незаконны выраб прадукцыі СМІ.

У якасці абвінавачаных – **Вольга Чайчыц, Сяргей Кавалёў, Любоў Лунёва, Ірына Арахоўская, Сяргей Краўчук**. Усіх іх вінавацяць у асвятленні дазволенай уладамі акцыі Дзяды 28 кастрычніка і вырабу відэапрадукцыі для спадарожнікавага тэлеканала “Белсат”.


40 базавых (980 рублёў) велічынь штрафу ад суддзі **Святланы Чараповіч** атрымала Вольга Чайчыц. Такі ж па памеры штраф і ў журналіста Сяргея Краўчука. Яго справу разглядала суддзя **Таццяна Ліннік**.


Вынік разгляду справы Ірыны Арахоўскай пакуль невядомы. Журналістка на суд не прыйшла, а агучыць ёй рашэнне па тэлефоне ў судзе адмовіліся.


Таксама ў гэты дзень у судзе Партызнаскага раёна прайшло яшчэ адно паседжанне ў дачыненні да незалежнага журналіста. **Генадзя Барбарыча** вінавацілі ў падрыхтоўцы матэрыяла для сайту "Радыё Рацыя". Але ў выніку суд вярнуў пратакол правапарушэння на дапрацоўку ў РУУС.

Твитнуть










"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні


Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY